ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 КРАСАВІКА 2014 г. ЧАЦВЕР № 76 (27686) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Тут вучаць армію любіць

Мытныя плацяжы — пад «двайным» кантролем

Настасся Сацюк: «Я чалавек авангарда»

ЛІЧБА ДНЯ

134,1 тыс. кв. м

агульнай плошчы жылля ўведзена ў эксплуатацыю ў Мінску ў першым квартале 2014 года для грамадзян, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэта 39,5% ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. Арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці ў студзені—сакавіку пабудавана 4983 кватэры (у I квартале 2013 года — 3805 кватэр). Уведзена ў эксплуатацыю 339,8 тыс. кв.м агульнай плошчы жылля, што складае 34% да прадугледжанага задання на год і 132,6% да аналагічнага перыяду мінулага года.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 18°
Віцебск	+ 12°
Гомель	+ 15°
Гродна	+ 14°
Магілёў	+ 12°
Мінск	+ 12°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.04.2014 г.

Долар ЗША	9970,00	▲
Еўра	13770,00	▲
Рас. руб.	279,50	▲
Укр. грыўня	857,63	▼

ISSN 1990 - 763X

У АБДЫМКІ ДА ВЯСНЫ

г. Быхаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Ведай нашых!

ГРАН-ПРЫ «ЗАЛАТОЙ ЛІЦЕРЫ» — У «ЗВЯЗДЫ»

Галоўную ўзнагароду конкурсу друкаваных СМІ атрымаў наш праект «Плацдарм»

Учора ў Мінску былі названы пераможцы і лаўрэаты X Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая Ліцера». Цырымонія ўзнагароджання прайшла ў Палацы Рэспублікі.

Юбілейны конкурс праводзіўся па 24 намінацыях. Усяго, па выніках працы мінулага года, да ўдзелу ў ім было пададзена 218 заявак. Традыцыйна ў конкурсе браў удзел і «Выдавецкі дом «Звязда». І небеспаспяхова! Праца нашых калег была заўважана і адзначана! Пераможцам і, адпаведна, уладальнікам «Залатой Ліцеры» — галоўнай журналісцкай узнагароды — у персанальнай намінацыі «Лепшы аглядальнік» стала **ўласны карэспандэнт «Звязды» па Брэсцкай вобласці Святлана Яскевіч.** У персанальнай намінацыі «Лепшы фотакарэспандэнт рэспубліканскіх, абласных друкаваных СМІ» званне лаўрэата атрымаў **вядучы фотакарэспандэнт нашай газеты Яўген Пясецкі.**

Лаўрэатам у катэгорыі «Лепшыя матэрыялы па тэматыцы спорту і здаровага ладу жыцця», у якой спаборнічалі паміж сабой рэспубліканскія і абласныя друкаваныя СМІ, інфармацыйныя агенцтвы, стала **рэдактар аддзела здаровага ладу жыцця Святлана Барысенка.** У катэгорыі «Лепшыя матэрыялы эканамічнай тэматыкі» лаўрэатам стаў **рэдактар аддзела эканомікі нашай газеты Уладзіслаў Кулецкі.**

А галоўную ўзнагароду — Гран-пры конкурсу «Залатая Ліцера» — у намінацыі «Лепшы творчы праект года рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў» прысуджаны газеце «Звязда» за спецвыпуск «Плацдарм» — **творчы праект пра армію і вайскоўцаў,** які мы робім пры садзейнічанні Міністэрства абароны.

Віншуем з перамогай усіх — і калег па рэдакцыі, і па журналісцкім цэху, і нашых чытачоў! І — да новых здзяйсненняў і здабыткаў на творчай ніве!

Сяргей РАСОЛЬКА

СВЕЖАЕ ПАВЕТРА БЕЗ ТРАГІЧНЫХ НАСТУПСТВАЎ

Праз адчыненае акно можа заляцець непатушаны недакурак ці выпасці дзіця

У Беларусі цяпер сапраўдная вясна. У такое надвор'е вокны ў жылых дамах зачыняюцца рэдка. З аднаго боку, гэта карысна: у кватэру паступае свежае паветра. З другога, расчыненыя без кантролю вокны з'яўляюцца і крыніцай небяспекі. У шматпавярховым доме праз іх можа прыляцець «сюрпрыз» у выглядзе незатушанага недакурка. Акрамя таго, непрычыненае акно цягне да сябе дзяцей, нібы магніт...

Злавіць дзіця самому

Выратавальнікі дагэтуль успамінаюць выпадак, які ледзь не стаў трагедыяй. Раніцай у адным са шматпавярховых дамоў камісія дзяржаўнага пажарнага надзору правярала пандус, які быў устаноўлены для інвалідаў-калясачнікаў. Калі камісія збіралася ўжо ад'язджаць, адзін з яе членаў выпадкова заўважыў у акне другога паверха малога хлопчыка, які залез на падаконнік і намагаўся вылезці на вуліцу. Толькі ратаўнік падбег да акна, як дзіця сарвалася ўніз… На шчасце, ён паспеў на ляту злавіць хлопчыка. Малога пасля абследавалі ў бальніцы, але ніякіх пашкоджанняў і траўмаў у яго не выявілі.

Падчас расследавання справы выявіліся цікавыя абставіны. Хлопчык быў дома не адзін! Бабуля завіхалася па хатняй гаспадарцы, а старэйшы брат глядзеў тэлевізар. Хлопчык быў без нагляду фактычна некалькі хвілін. Але гэтага яму хапіла, каб прыйсці на кухню, залезці на канапу, а адтуль высунуцца ў расчыненае акно…

Добра, што за крок ад трагедыі аказаўся прафесійны ратаўнік. Але што рабіць, калі б на яго месцы аказаўся не падрыхтаваны да такой сітуацыі чалавек?

— Неабходна на месцы ацаніць абстаноўку і пралічыць, што можа здарыцца ў некалькі наступных секунд, — раіць **памочнік Міністра па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Калі пад рукой ёсць мабільны тэлефон, трэба тут жа набіраць нумар 101 і пакрысе набліжацца да акна. Справа ў тым, што ратавальнікі будуць накіраваны на выклік прыкладна на 15-й секундзе. Да таго ж дыспетчар параіць, як трэба сябе весці, як размаўляць з малым… Але ў такой сітуацыі забаронена крычаць, рабіць рэзкія рухі. Дзіця можа няправільна зрэагаваць на гэта — напрыклад, рэзка варухнуцца і сарвацца ўніз…

Калі ж дзіця ўжо знаходзіцца ў рэжыме вольнага падзення, то пытанне аб тым, спяшацца яму самастойна на дапамогу ці не, застаецца на сумленні сведкі.

СТАР. 3